# З ПАВАГАЙ ДА РОДНАЙ МОВЫ

**З 21 лютага 2000 года па рашэнні ЮНЕСКА ў краінах свету адзначаўся Дзень роднай мовы. Вядучыя беларускія гуманітарныя ўстановы традыцыйна падтрымалі гэту ініцыятыву.**

Напрыклад, ЦНБ імя Я.Коласа НАН Беларусі ў гэтым годзе правяла акцыю «Мова продкаў маіх і нашчадкаў маіх – беларуская родная мова». Цэнтральнае месца занялі літаратурныя чытанні твораў беларускіх песняроў – Якуба Коласа і Янкі Купалы.

У праграме мерапрыемства былі кніжная выстава, прысвечаная гісторыі нацыянальнай мовы, якая непарыўна звязана з духоўнай культурай беларускага народа. Раздзелы выставы адлюстроўвалі шляхі развіцця пісьмовай спадчыны беларусаў: ад старабеларускай да літаратурнай мовы XX-XXI стагоддзяў. Народна-дыялектная мова, літаратурныя нормы маўлення і правапісу, беларуская мова сярод іншых славянскіх моў – гэтыя і іншыя пытанні прадстаўлены ў працах беларускіх даследчыкаў. Таксама ўдзельнікі акцыі прагледзелі фільм «Духоўны прарок і зямны чалавек» (да 130-годдзя з дня нараджэння Я.Купалы), паўдзельнічалі ў конкурсе-віктарыне «У сузор'і геніяў».



Паэтычныя чытанні твораў Я.Коласа і Я.Купалы сабралі студэнтаў ВНУ, прадстаўнікоў Інстытута імя Гётэ ў Мінску, Польскага інстытута ў Мінску. Кожны жадаючы змог запісаць сваё выступленне на відэа.

Не застаўся ў баку ад Дня роднай мовы і БДУ. Акрамя філалагічнага факультэта і Інстытута журналістыкі, дзе мерапрыемства расцягнулася на тыдзень, у гэтым годзе свята выйшла на ўзровень універсітэта. Так, выкладчыкі філфака правялі лекцыі-гутаркі на тэму «Беларуская мова як неацэнны скарб народа» на 12 факультэтах. Пра вяртанне гісторыка-сацыяльных каштоўнасцяў і ролі СМІ распавядалі Адам Мальдзіс і Навум Гальпяровіч, а студэнты-журналісты прымалі гасцей з рэдакцый часопісаў «Бярозка» і «Маладосць». Гутаркі, сустрэчы і майстар-класы праводзіліся ў Інстытуце журналістыкі. У галоўных урачыстасцях універсітэта прымаў удзел рэктар БДУ, акадэмік Сяргей Абламейка, а ў якасці ганаровых гасцей былі член-карэспандэнт Аляксандр Лукашанец і паэт Уладзімір Карызна.

**Алена БЯГАНСКАЯ, «Веды»**
**Фота А.Сцефановіча**

**На фота: ўдзельнікі літаратурных чытанняў у ЦНБ**